


# ПЕРЫФРАЗЫ – ЖЭМЧУГ СКАЗАЎ

**У гродзенскім выдавецтве «ЮрСаПрынт» выйшла чарговая кніга Ганны Скаржынскай-Савіцкай для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту. «Жамчужына роднага краю» – так называецца новы зборнік, які складаюць апавяданні на тэмы беларускіх перыфразаў. Пісьменніца выбрала самыя каштоўныя «пярлінкі» для беларускіх дзяцей. Таму і назва кнігі пачынаецца з вобраза каштоўнага каменьчыка – жамчужыны.**

Нагадаем, што раней у кнізе «Кветка малой радзімы» Г. І. Скаржынская-Савіцкая патлумачыла сэнс 50 прыказак і прымавак; у кнізе «А ў нас – зорны час!» – значэнні 40 фразеалагізмаў. Таму адметнай рысай творчасці пісьменніцы з'яўляецца імкненне данесці да юнага чытача каштоўнасці беларускай мовы, прывіць дзецям любоў да роднага слова, захаваць моўную спадчыну. І ў сваёй прадмове аўтар заклікае нашчадкаў падхапіць і захаваць гэтую спадчыну.

У вершы, які Ганна Іосіфаўна прысвяціла таксама перыфрызам, яна называе іх «жамчужынамі», «бурштынкамі-залацінкамі», упрыгожваннямі, букетамі, салютамі сказаў. Для сваіх твораў пісьменніца выбрала перыфразы, якія праслаўляюць Беларусь, яе непаўторнасць, прыгажосць, багацце. Творы прасякнуты любоўю да Радзімы, роднага краю. Невыпадкова выбраны героі апавяданняў: настаўнік – вучні, дзядуля – унук, бабуля – унучка, маці – дачка... Хто ж можа перадаць моўную спадчыну падлеткам, калі не родныя ці настаўнікі, лічыць пісьменніца.

Кніга будзе карысным дапаможнікам не толькі дзецям, але і настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, выхавальнікам, бацькам.

Вёрстку, яркае каляровае афармленне кнігі пісьменніца выканала сама. У хуткім часе новая, 20-я па ліку кніга Ганны Скаржынскай-Савіцкай «Жамчужына роднага краю» з'явіцца ў бібліятэках і гандлёвай сетцы.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**